Как показало исследование, серьезную проблему представляет также пассивное поведение потерпевших в уголовном процессе. По данным виктимологического опроса, значительная часть потерпевших, обратившихся в правоохранительные органы – 42 % российских и 60 % белорусских, в судебном разбирательстве по факту совершения в отношении их преступления не участвовала. Среди тех, кто принимал участие в судебном разбирательстве, удовлетворенными его результатами оказалось лишь 25 % россиян и 32 % белорусов. Причиненный преступлением вред не был возмещен в рамках рассмотренных уголовных дел в отношении 34 % российских и 37 % белорусских потерпевших.

Очевидно, что преступности и виктимизации, как массовым антиобщественным явлениям, общество должно противопоставить эффективно действующую систему социального контроля преступности и обеспечения прав потерпевших от преступлений.

УДК 343.213.5

***А.М. Сяргейчык***

## БОЛЬШ СПРЫЯЛЬНЫ КРЫМІНАЛЬНЫ ЗАКОН: ПРАБЛЕМА ТЭРМІНАЛАГІЧНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ

Гаворачы аб тэрміналагічным забеспячэнні тэмпаральнага функцыянавання крымінальнага закона, нельга абысці ўвагай праблему пэўнага тэрміналагічнага разнабою, які назіраецца ў юрыдычнай літаратуры пры вызначэнні крымінальнага закона, які падлягае прымяненню ў адносінах да асоб, якія ўчынілі злачынства да ўвядзення яго ў дзеянне.

Большасцю вучоных (М. І. Блум, Ф. Ліст, А. М. Мядзведзеў, А. А. Ціле і інш.) выкарыстоўваецца тэрмін «больш мяккі закон». Сустракаецца ён і ў нарматыўных прававых актах, напрыклад у рашэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 21 кастрычніка 2003 г. № Р-160/2003 «Аб падставах перагляду прысудаў у адпаведнасці з правілам аб зваротнай сіле крымінальнага закона» і шэрагу іншых.

Радзей у крымінальна-прававой дактрыне выкарыстоўваецца вызначэнне «больш спрыяльны закон» (рус. – благоприятный) (А.Я. Якубаў і інш.).

Тэрмін «больш спрыяльны закон» выкарыстоўваецца таксама на заканадаўчым узроўні ў шэрагу крымінальных кодэксаў замежных дзяржаў. Так, больш спрыяльнымі (gunstigste) падобныя законы называюцца ў ч. 2 арт. 1 Крымінальнага кодэкса Нідэрландаў.

Шэраг навукоўцаў выкарыстоўваюць выраз «больш паблажлівы закон» (рус. – снисходительный). Так, А.М. Ярасаў адзначае, што «гістарычнае развіццё крымінальнага заканадаўства ў частцы рэгламентацыі рэтраактыўнасці крымінальных законаў сведчыць аб існуючай тэндэнцыі яго гуманізацыі ў выглядзе паслядоўнага звужэння практыкі выкарыстання зваротнай сілы больш строгіх крымінальных законаў пры адначасовым пашырэнні межаў зваротнага дзеяння крымінальных законаў, больш да вінаватага паблажлівых».

Разбяром прыведзеныя варыянты.

У адпаведнасці з ч. 2 арт. 9 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь зваротную сілу мае закон, які ўстараняе злачыннасць дзеі, змякчае пакаранне або іншым чынам паляпшае становішча асобы, якая ўчыніла злачынства.

Прымаючы пад увагу дадзенае заканадаўцам вызначэнне, уяўляецца немэтазгодным пры вызначэнні закона, што падлягае прымяненню ў адносінах да асоб, якія ўчынілі грамадска небяспечную дзею да набыцця ім моцы, выкарыстоўваць тэрмін «больш мяккі закон», бо словазлучэнне «больш мяккі» карэлюе па значэнню з выразам «які змякчае» (рус. – смягчающий), які выкарыстоўваецца заканадаўцам для вызначэння закона, які адрозніваецца больш мяккай санкцыяй (закон, які змякчае пакаранне). Інакш кажучы, больш мяккімі крымінальнымі законамі не вычэрпваецца пералік законаў, якія падлягаюць прымяненню ў адпаведнасці з ч. 2 арт. 9 КК.

Тут, аднак, неабходна адзначыць, што беларускі заканадавец праяўляе пэўную тэрміналагічную дваістасць: з аднаго боку, ўжывае выраз «які змякчае» (рус. – смягчающий) пры вызначэнні крымінальнага закона, які мае больш мяккую санкцыю (крымінальны закон, які змякчае пакаранне), з другога ж боку, разумее пад больш мяккім закон, які ўстараняе злачыннасць дзеі, змякчае пакаранне або іншым чынам паляпшае становішча асобы, якая ўчыніла злачынства. Так, ч. 4. арт. 9 КК гаворыць: «Калі крымінальны закон, які дзейнічаў падчас учынення злачынства, быў адменены або зменены крымінальным законам, які ўстараняе злачыннасць дзеі, змякчае пакаранне або іншым чынам паляпшае становішча асобы, якая ўчыніла злачынства, але да часу расследавання крымінальнай справы або разгляду справы ў судзе набыў моц іншы больш строгі крымінальны закон, прымяненню падлягае найбольш мяккі прамежкавы закон».

Цяпер разгледзім лексічныя значэнні прыметнікаў паблажлівы і спрыяльны. Звернемся да «Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы» пад рэдакцыяй М.Р. Судніка і М.Н. Крыўко». Паблажлівы – нястрогі, непатрабавальны; мяккі, велікадушны. Спрыяльны – які садзейнічае, памагае (ад дзеяслова спрыяць – садзейнічаць, памагаць). Як бачна, нягледзячы на семантычную блізкасць дадзеных прыметнікаў, іх лексічныя значэнні не тоесныя. Так, прыметнік «паблажлівы» мае адценне значэння, што збліжае яго з выразам «які патурае» (ад дзеяслова «патураць» – некрытычна ставіцца да чаго-небудзь заганнага, адмоўнага).

Зразумела, што заканадавец, фармулюючы правіла аб прымяненні крымінальнага закона, які ўстараняе злачыннасць дзеі, змякчае пакаранне або іншым чынам паляпшае становішча асобы, якая ўчыніла злачынства да набыцця такім законам моцы, не меў на ўвазе патураць такой асобе. Адпаведна, тэрмін «больш паблажлівы крымінальны закон» не зусім дарэчны ў разглядаемым кантэксце.

Што тычыцць тэрміна «больш спрыяльны крымінальны закон», то, зыходзячы з лексічнага значэння прыметніка «спрыяльны» (які садзейнічае (у разгляданым выпадку – рэалізацыі крымінальна-прававога прынцыпу гуманізму), памагае (асобе, якая ўчыніла злачынства, шляхам паляпшэння яе ранейшага становішча), можна зрабіць выснову, што дадзены тэрмін ў семантычным сэнсе найбольш дакладна адлюстроўвае ўкладваемае ў яго крымінальна-прававой дактрынай значэнне закона, што ўстараняе злачыннасць дзеі, змякчае пакаранне або іншым чынам паляпшае становішча асобы, якая ўчыніла злачынства.